УДК 821.161.3 – 192* Таіса Мельчанка

# ПЕСЕННАЯ ЛІРЫКА ТАІСЫ МЕЛЬЧАНКІ

*Бароўская І. А.*

**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

На працягу ўсяго свайго існавання чалавецтва суправаджала песня, якая прыйшла да нас з даўніх часоў ад пакалення да пакалення і захавала ў сабе няўлоўны ход гісторыі і духу народа, непаўторныя рысы адметнага нацыянальнага характару. Гэта не просты падбор слоў, аб'яднаных рыфмай, гэта свайго роду магічныя словы, якія пэўным чынам уздзейнічаюць на чалавека, яго эмацыянальны і душэўны стан. Менавіта песні належыць адно з першых месцаў па ўздзеянні на душу чалавека. "Лірычныя песні, песні пра каханне — гэта пераважна мастацкая творчасць жанчыны. Своеасаблівы унутраны свет і псіхалагічны склад характару жанчыны, тонкі, уражлівы і вельмі эмацыянальны лад яе душы, заўсёды настроены ва унісон з пачуццямі любові і кахання" [1, с. 6]. Так сцвярджаў даследчык А. І. Гурскі у дачыненні да народнай песні, але гэта поўнасцю адносіцца і да прафесійнай.

Пры напісанні артыкула мы выкарысталі розныя зборнікі вершаў Т. Мельчанкі.

***Мэта***

Тэматычная і жанравая разнавіднасць песеннай лірыкі гомельскай паэткі Таісы Мельчанкі.

***Метады даследавання:*** даследчы, пошукавы, аналітычны, апісальны.

***Абмеркаванне***

Сучасны пласт беларускай прафесійнай песні складаюць такія вядомыя і таленавітыя жанчыны, як Галіна Кутас, Вальжына Цярэшчанка, Ала Фіялкоўская, Ганна Вязніцкая, Валянціна Ермалёнак, Таіса Мельчанка і шмат іншых.

*Той песні ўжо ўлілася ў мяне сіла,*
*Распальвала агонь любві святой.*
*Гісторыю да донца варушыла,*
*Вяла па родным краі за сабой.*

Гэта радкі з прыгожага песеннага твора "Матчына песня" Таісы Мельчанкі — вядомай паэткі Гомельшчыны, перакладчыцы, якая мае 11 зборнікаў вершаў, шмат якіх сталі песнямі. Не аднойчы яна будзе гаварыць аб значнасці песні ў станаўленні Беларусі, захаванні родных традыцый і мовы. У "Нашынскай песні" яна сцвярджае, што ніхто не чуў лепшую за нашынскую, бо ў ёй ўвабраны слёзы, стогн і плач і "гартавалася яна ў полымі". А "Беларусачка" ў выкананні Б.Данчыка "і бязмоўнага прымусіць на роднай мове гаварыць". *Непадробнай лірай* называе яна мову народнай песні, якая пульсуе, нібы сок той бярозы, звініць у паднябессі салаўём. Толькі ад *Матчынай песні* можна ўваскрэснуць *салёнай слязою Айчыны* і загаварыць так, як вучыў самы дарагі чалавек на свеце.

*Матулі песня – скарбніца святога.*
*Ці ж я забуду дарагі матыў?*
*О мой народзе, на душы вяснова —*
*Ты непадробнай лірай надзяліў.* ("Непадробная ліра")

Песенная лірыка Таісы Мельчанкі даволі разнастайная: яна выразна філасафічная, метафарычная і велічная, як у песні "Дрэва славянства". У свой час славуты патрыёт славянскага свету Ян Колар стварыў паэтычную краіну Славію, у якую аб'ядналіся ўсе славянскія народы. І сімвалам гэтага славянскага яднання сталася велічнае дрэва ліпа, якое надзвычай адпавядае душы нашых слаўных продкаў. Т. Мельчанка ў сваёй песні (кампазітар М. Збараскі) паказвае новыя апакаліпстычныя выпрабаванні, што выпалі на долю славянства

ў 20 стагоддзі, але адначасова выказвае вялікую ўпэўненасць у перамозе нават глабальных катастроф дзякуючы нашаму адзінству і веры.

У большасці песняў, музыку для якіх склаў В. Аўчыннікаў, Т. Мельчанка ўслаўляе прыгажосць роднай зямлі, якая чароўная ва ўсе поры года, але асабліва ўвосень, якая ціха стукае ў шыбіну і прыпадае жоўтым лістком да вакна, тчэ бурштыновыя кашулі бярозкам і клёнам, дожджыкам тушыць пажар арабін. І толькі адлятаючы клін расплаўляе самоту, як льдзінку (“Чарадзейка”) і саступае красуні-зіме, што будзе ткаць новыя ўзоры на палітры роднай прыроды (“Шчодрасць”).

Сімвалам кругазвароту жыцця з’яўляецца бохан хлеба на стале, бо ён увабраў у сябе глыбінныя сокі, сінь неба, гаючую сілу ласкавай матулі-зямлі:

*Хлебаробскую працу, як зерне, узважыць няможна.*
*Столькі ўкладзена сілы, святочна каб ззяў каравай.*
*Сёння музыка жніўня гучыць і гучыць пераможна,*
*Як надзея сялянства на будучы зноў ураджай.*

Наогул, Т.Мельчанка, у адрозненні ад многіх паэтаў, песні прысвячае восені, а не вясне (“Жнівеньскі матыў”, “Зямное прыцяжэнне”, “Прэлюдыя восені”, “Стук восені”, “Развітанне з восенню ” і інш.).

На гэтай запаветнай зямлі ёсць самы прыгожы горад на свеце – Гомель, які ўяўляецца такім рамантычным і прыгожым:

*Нямала прыгожых яшчэ гарадоў.*
*Ды ты – мой адзіны да скону.*
*З табою і радасць дзялю, і любоў,*
*І нават слязіну салёну* (“Горад-казка”)

Няшмат на свеце гарадоў, якім прысвячаюць песні. Мы не згадваем Парыж, Маскву, Мінск. А таму песні Т. Мельчанкі пра Гомель увойдуць у скарбонку славы роднага горада.

Для паэткі роўнавялікія любові да Гомеля, з якім звязаны юнацтва і сталасць, і маленькай радзімы, дзе пранеслася басаногае дзяцінства. “Сарцавінай роду” становіцца ПЕСНЯ, якая, згадаўшы спрадвечнае “Жаданне” Т. Мельчанкі, вядзе яе да родных бярозак на “Шчасце сустрэчы”. Яе лірычны герой, як і сама аўтар, жыве праблемамі Айчыны, ёй баліць трагедыя маладых хлопцаў (“Бусел Афгана”, “Нявінныя душы”).

Але, як і ўсе паэты, тым болей паэткі, песні прысвячае каханню, якое ў яе песеннай лірыцы, не буяе страсцямі і пажаданнямі (“Варожка-ноч”), а выступае больш мінорным, напаўняецца лёгкім сумам. Карціна разлукі значна ўзмацняецца “Іроніяй лёсу”:

*Ляцяць гады — незацугляны коні.*
*Што ветрам адымчала — не дагнаць.*
*Ды помняць шчасце вочы і далоні.*
*Мяне ўспамінам будуць саграваць.*

Складаную вобразна-выяўленчую палітру песеннай лірыкі Т.Мельчанкі падкрэслівае і адметнасць музыкі да гэтых твораў. Так, кампазітар В.Аўчыннікаў сцвярджае, што якраз у паэзіі Таісы Мельчанкі ён знайшоў неабходныя словы для сваіх мелодый. Так, у некаторых творах ён выкарыстоўвае рамансавую стылістыку. У песні-рамансе “Не бягу на спатканне” ён прытрымліваецца скрупулёзна тэксту, стараецца не мяняць словы, радкі, каб арганічна звязаць і ўвасобіць думкі і перажыванні паэта. “Весная песня” разлічана для саліста, яна эстрадна-народнага тыпу, традыцыйны шлягер. “Мой Гомель” — твор, у якім адчувальна местачковая традыцыя. З другога боку, “Дзівосы восені” напісаны для акадэмічнага хору, бо верш — узор пастаральнай лірыкі, якая вызначаецца асаблівым адметным гучаннем. “Развітанне з восенню” разлічана для народна-эстраднага або акадэмічнага хору, бо гэта лёгкі лірычны твор. А вось “Восеньскі матыў” — створаны для выканання народнага хору, вельмі ёмісты, вылучаецца мяккасцю знутры. Яскравыя карціны прыроды прыцягваюць сваёй скупасцю і прастатой ў выкарыстанні вобразна-выяўленчых сродкаў. “Жнівеньскі матыў” ствараўся для вялікага разгорнутага хору. Гэта ттвор аб вёсцы, хлебе, карагодзе, з вясковымі матывамі, усё аб’яднана адзіным колам малюнкаў. Шкада, што так даўно не пісаліся творы падобнай тэматыкі. А менавіта яны нясуць так многа праўды і паэзіі.



Репозиторий ГомГМУ

Як сведчыць сама Т. Мельчанка, яе тэксты пакладзены на музыку кампазітарамі М. Пятрэнка, А. Гулаем, У. Надтачэем. "Многія сцвярджаюць, што мае вершы напеўныя, з фальклорнымі матывамі. Меладычнасць і напеўнасць збірала маё сэрца яшчэ ў дзяцінстве, калі чула пад гукі гармоніка раздольныя вясковыя песні на бяседах сяльчан і ваякоў, на вячорках дзяўчат. Я стала паэткай, дзякуючы роднай зямельцы, тым караням, што моцна звязалі мяне з ёю. Яны і да сёння жывяць сваім цудадзейным сокам маю паэзію. Няма такой зямліцы, як мая!..."

***Заключэнне***

Песенная лірыка Таісы Мельчанкі вельмі разнастайная жанрава і тэматычна. Намі вызначаны філасафічнасць, метафарычнасць і рамансавая стылістыка паэтычных радкоў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Гурскі, А. І.* Тайны народнай песн / А. І. Гурскі. — Мінск: Універсітэцкае, 1994. — 160 с.

**УДК 614(476.2)**

## САНИТАРНО-ЭПИДЕМИОЛОГИЧЕСКАЯ СЛУЖБА ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ: ВЧЕРА, СЕГОДНЯ, ЗАВТРА

***Бортновский В. Н.[1], Тирещенко Л. А.[1], Тарасенко А. А.[2]***

**[1]Учреждение образования**
**«Гомельский государственный медицинский университет»,**
**[2]Государственное учреждение**
**«Гомельский областной центр гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья»**
**г. Гомель, Республика Беларусь**

В 2017 году исполняется 95 лет создания в г. Гомеле первой на постсоветском пространстве санитарной эпидемиологической станции.

29 октября 1922 года в г. Гомеле по инициативе видного организатора санитарного дела и здравоохранения Беларуси заведующего санитарно-эпидемическим отделом Гомельского губернского здравотдела Константина Юлиановича Кононовича была создана Гомельская санитарная станция им. 5-й годовщины Октябрьской революции — первое на территории СССР учреждение такого профиля.

По замыслу К. Ю. Кононовича новое санитарное учреждение должно было объединить как санитарную и противоэпидемическую работу, так и разрозненные учреждения санитарного профиля, являться оперативной, производственной и научной базой санитарной организации в сфере оздоровления труда и быта населения, борьбы с инфекционными заболеваниями.

Основным учреждением, положившим начало созданию Гомельской санэпидстанции, следует назвать химико-бактериологическую лабораторию, образованную в феврале 1921 года, на базе 4 национализированных частных химико-бактериологических кабинетов и городской лаборатории.

В эти годы произошло расширение противоэпидемической работы. Было налажено производство оспенной вакцины, развернулась борьба с малярией, организовано дифференцированное обслуживание населения по санитарным вопросам.

Увеличение количества структурных частей санэпидстанции сопровождалось расширением штата ее сотрудников. Начав в 1922 году свою деятельность в составе 5 врачей, она в 1927 году уже насчитывала 7 санитарных врачей и врачей-эпидемиологов, 2 врачей-гигиенистов химиков, 2 кандидатов естественных наук, многочисленный средний медицинский и вспомогательный технический персонал. Штатные возможности позволили Гомельской санэпидстанции первой в 1924–1925 годах перейти на дифференцированное обслуживание населения по отдельным специальностям санитарного дела (пищевая, коммунальная, школьная санитария).

В то же время отсутствие в 20-х годах централизованного снабжения дезинфекционным оборудованием медицинских учреждений потребовало от работников санэпидстанции нала-

Репозиторий ГомГМУ